БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб.
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 66. Менск. Чацьвер 13 чэрвеня 1918 г. Год

Голас грамадзянства.

Маладой Рэчы Паспалітай Беларускай ад першых жа рокау яе дзержаунага жыцця прыходзіцца вясьці досыць упорную барацьбу за сваю тэрыторыю і бараніцца ад надмерных апэтытау суседзяу. Звычайно у такой спрэчцэ пытаня разьвязываюцца парауннаннем сілау: хто дужэйшы, за тым і прауда. Але трэба спадзавацца, што цяпер гэта перастарэлая формула зьменіцца і заменіцца больш стасоунай. Беларусь мае права чакаць справядлівага да сябе узгляду з боку усіх дзержавау, найбольш, ад сваей старшай сястры—Украіны. Але очэвістасьць прымушае нас часамі шкадуючы сумлевацца у братэрскік стасунках да маладой дзержавы. Апублікаваная у свой час прапазыцыя украінскай дэлегацыі у перагаворах з дэлегацыяй Беларускаго Ураду назначыць украінска-беларускую граніцу пауночней жалезьніцы Пінск—Гомэль, сьведчыць, што старыя формулы яшчэ ні занаміняюцца. Да гэтаго дня ідзець гутарка, што Украіна станоучa заяуляе прэтэнсію на адвечна беларускія землі што ляжаць у обласьці Прыпяці.

Зразумело дзеля гэтаго што усе колы беларускаго грамадзянства занепакоены гэтай гутаркай і пачынаюць падаваць свой голас на абарону роднаго краю. Адным з найбольш яскравых фактау гэтаго гатунку трэба прызнаць пастанову сходу упоунамочаных *„Зьвязку большых і меньшых уласьнікау і арандароу Пінскаго, Рэчыцкаго, Мазырскаго і Гомэльскаго паветау»*.

Спасылаючыся на акольнік Генэральнаго Пісарства (Украіны) ад 30 сакавіка г. г. за № 452, с катораго без вонтпення выходзіць, што гэтыя паветы ні уходзяць у склад Украіны, зьвязак такім спосабам даводзіць сваю прыналежнасьць да Беларусі:

«Насяленне абшэрнаго краю, займаючаго нашыя чатыры паветы, складаецца галуным чынам з густой масы селян беларусау, уладаючых 30% усяе зямлі і землеуласьнікау польскай і рускай нацыянальнасьці, у руках якой знайходзіцца 58% зямельнаго абшару. Астальных 12% зямлі складаецца з казенных і меськіх грунтау. Такім чынам этнаграфічно сельскае насяленне ні мае ніякаго зьвязку з Украінай.

Гісторычна нашыя паветы былі на працягу 600 гадоу зьвязаны с польска-літоускаю дзержаваю аж да 1772 г. калі Гомэльскі павет які уходзіу тагды пад найменнем Веліцкаго у склад Менскаго ваяводства, а у 1795 г. і астальныя паветы былі прылучаны да Расіі. Такім парадкам органічнаго зьвязку з Украінай у нас ніколі ні было. Стасоуна да гістарычнай прошласьці усе культурнае развіцце краю ішло пад упылывам захадніх пацекау».

Грунтуючыся на гэтым зьвязак землеуласьнікау 4 паветау: *лічыць ніабходным «раздзяліць сваю палітычную будучыну з сваім адвечным цэнтрам—Менскам»*.

Голас грамадзянства такога абшэрнаго району, пры гэтым злучанаго і зьлітаго у моцны зьвязак павінен быць услышаны усімі каму чуць належыць. Голас гэты ясны і ні пазваляе талкаваць яго як небудзь крыва. З асобнай увагай павінен прыслухацца да гэтаго голасу п. Стош, Гомельскі Стараста які з вялікай энэргіяй састауляе, пасылае і маршалкуе у «Украінскіх дэпутацыях“ Беларускіх земляу.

Менскі.

(«Бѣлорускоє Эхо», Кіеу 30/V 1918).

Агульныя вісткі.

КІЕУ (Б.Т.Б.) «Кіевская Мысль» паказвае, што паўстанне казацкаго насялення проці большэвікоў у Кубані усё болей разрастаецца. Казакі пачалі наступленне ад Темрука проці Апапы і Новарасійска і дайшлі да берагу Кубані.

У Мэлітполі перахоплена іскровая тэлеграма большэвікоў с Ташкэнту ў Маскву. У ёй гаворыцца, што палажэнне тамтэйшаго савецкаго ўраду с прычыны голаду, халеры і безрабоцця вельмі папсавалося. Ташкенцкая рада дамагаецца прысылкі зараз-жэ збожа і 10 мільёнаў рублёў на патрэбы рады. Аднак, просьба гэта ні можа быць споўнена, бо Туркестан адрэзан Ад Расіі вайскамі Дутова і чэска-словацкімі дружынамі.

БЭРЛІН. Аб труднасьцях, якія выяўляюцца пры ладжэнні «народнае арміі» ў Расіі, сьведчыць цыркулярнае пісьмо савецкаго ўраду. Загад ураду аб арганізацыі мейсцоваго военнаго упраўлення ні споўнен, —ды з гэтае прычыны, як відаць, німа як арганізаваць чырвоную армію.

29 мая, пад націскам контр-рэвалюцыйнаго руху, цэнтральны спаўніцельны камітэт савецкаго ўраду разглядаў пытанне аб агульнай военнай павіннасьці. Пераход с сыстэмы дабравольнай да сыстэмы прымусоваго набору рэкрутаў пастаноўлен усімі галасамі проці 4. Военны камісарыят атрымаў загад у адзін тыдзень апрацаваць плян набораў у Маскве, Донскай і Кубанскай обласьцях—значыць, там, дзе найбольш баяцца контр-рэволюцыі.

БЭРЛІН. Прэзыдыум Камісіі і падкамісіі нямецка-украінскаго таварыства прынялі ўчора рэзолюцыю, вітаючы нямецкую палітыку на Украіне і пастанову Нямеччыны падзержываць свабоду і дзержаўную ніззалежнасьць украінскаго народу. Рэзолюцыя вітае забезпечэнне праўных норм на Украіне і аддачу зямлі украінскім селянам за плату, паддзержываючы прынцып асабістае ўласнасьці. Рэзолюцыя дамагаецца шырокаго стасавання украінскіх нацыянальных сіл пры будаванні дзержавы і упраўлення, украінізацыі школьнае справы, асабліва народных школ і нацыяналізацыі украінскай царквы.

БУКАРЭШТ. Румынскія газэты паказываюць, што англічане зусім запанавалі ў паўночнай Расіі і ў портах Белаго мора. Англіцкі камэндант мае дыктатарскую уласьць над узьбярэжжэм. Таргоўля пераходзіць у англіцкія рукі. Расійскія падданыя прымушэны прасіць пазвалення на таргоўлю ў англіцкае ўласьці. Устаноўлен англіцкі кантроль папапартоў. Адным словам, гэта часьць Расіі памалу абэртаецца ў англіцкую калонію.

КІЕУ (Б.Т.Б.) 8/VI. Галава рады кубанска-чорнаморскае рэспублікі тэлеграмай давёў да ведама расійскай мірнай дэлегацыі, што, апрыч спаўніцельнаго камітэту рады народных камісараў, на Кубані німа ніякае іншае ўласьці і што ядыны прэдстаўнік на мірнай конфэрэнцыі ёсьць прэдстаўнік расійскай савецкай рэспублікі, часьць каторай становіць кубанска-чорнаморская рэспубліка.

ГААГА. Бэльгійскі ўрад заявіў перад усімі ўрадамі пратэст проці арганізацыі ў Бэльгіі нямецкіх судоў, бо гэта нізгодна з міжнародным правам.

«Нордд. Аллг. Цтг.» адказывае па гэта, што організацыя нямецкіх судоў вызвана забастоўкай бэльгійскіх юрыстаў.

ГААГА 8/VI. Адкрыта англіцка-нямецкая конфэрэнцыя аб замене военна-палонных. Будуць разгледжэны 6 пунктаў, зьвязаных з заменай.

Чародцае заседанне—ў панядзелак.

ЖЭНЭВА 9/VI. Як прымечае «Омм Лібр», двухгадзінная перамова Клемансо з Гэгам і Мільнерам тычылася тѣксама перагрупіроўкі войск дзержаў Згоды [Согласія], напрыклад у ваколіцы Монтдзодье, зрабіўшайся патрэбнай дзеля апаскі перад новымі гэрманскімі прэдпрыімствамі.

Наведзены парадак узмацаванняў каля Парыжа затрымаўся, як палагаюць, с прычын надзвычайных патапленняў транспортаў у канале Ляманш.

На беларускім шляху.

Падаем тутака надрукованы у № 3 газ. «Минскій Еженедѣльникъ», канец размовы супрацоўніка газэты с п. Р. Скірмунтам, — аб ўзаемных стасунках Беларусі і яе суседзяў:

Зацікауленнасьць Нямеччыны у стварэнні Беларускай дзержавы, як буффэра паміж Польшчай, Літвою, Украінай і Вялікаросіяй падказуецца ні адно палітычнымі, але і экономічнымі прычынамі.

Беларусь край сельска-гаспадарскі. Ягомасьць Р. Скірмунт—праціўнік тае думкі, што Беларусь ні здолае сама сябе карміць. Адна Менская губ. пры нізкім стопню земляробства дае лішку у 3 мільёны пуд. хлеба. А калі за помаччу нямецкаго капіталу і тэхнікі асушыць балоты, то Менскае Палессе можа даць сена для усей Нямеччыны, ні кажучы ужо аб магчымасьці развіцця скатаводства у краю. Апроч гэтаго Нямеччына можа атрымоўваць з Беларусі вялікія запасы лесу.

З другога боку Нямеччына дасьць Беларусі усе патрэбныя вырабы прамысловасьці, начэння і машыны для сельскай гаспадаркі, так сама тэхнічную помач у справе развіцця умеркованай прамысловасьці, магчымаго толькі пры падтрыманні з боку.

З Расіяй могуць быць толькі прыязныя стасункі, хаця тамака цяпер і німа с кім весьці перагаворы. Есьць аднак нібезпечнасьць таго, што Расія, як даўней пануючы народ, доўгі час ні будзе у стане выясьніць сабе право народаў на самаазначэнне. Наогул, тамака разуменне гэтаго права надта паверхоўнае, чаму былі даказы нават у часе рэвалюцыі. Гэто прымушае станавіцца да Расіі у вычэканні.

З Украінай Беларусь зьвязана і гістарычнымі падзеямі і родствам. З абодвых бакох цяпер хочуць устанавіць самыя блізкія прыязныя стасун-

кі. Спрэчнай ёсьць справа беларуска-украінскіх рубяжоў установленых берасьцейскай умоваю без учасьця прэдстаўнікоў Беларусі. Спрэчнасьць датыча Менскаго і Гараднэнскаго Палесся і поўночнай Чарнігаўшчыны замешканай беларусамі. Тыя што робяць размежавання стаяць на этнографічным пўнкце, але тутака вялікую ролю іграюць інтарэсы гістарычныя, географічныя і экономічныя. Поўднёвая часьць Меншчыны (Мазырскі, Рэчыцкі і часьць Пінскаго пав.) засялена беларусамі. Другая часьць Пінскаго пав. Кобрынскі і часьць Берасьцейскаго пав. Гародн. губ. насяляюцца галінай абодвых народаў—беларускаго і украінскаго—т. зв. «паляшукамі», ні «пінчукамі». З мовы яны болей украінцы, па складу жыцьця і звычаям,—беларусы. Географічна экономічна і палітычна яны з Беларусьсю і цягнуць да Бальтыцкаго мора. Граніцы Менскай і Гародн. губ. маюць за сабой гістарычнае значэнне. Яны устанаўляліся 600 гадоў таму назад як граніцы паміж Беларусьсю і Украінай, ішчэ за Міндоўгам, і былі узмацаваны Любэльскай уніяй, калі Украіна была аддзелена ад Літвы. Граніцу гэтую прызнаваў нават рускі урад пры адміністратыўным устройстве поўн.-зах. краю.

З Літвою у Беларусі—гістарычны зьвязак. Літва ні была заваёўнікам Беларусі, але сама бараніла Беларусь ад татарскай няволі. Беларусь і Літва заўсёды жылі у згодзі і уся літоўская дзержаўнасьць была пранята беларускай культурай. Цяпер магло-б паўстаць пытанне аб Вільні, але трэба думаць, што яно развяжацца памысльна для абодвых старон. Збліжэнне з Літвой і цяпер падказуецца Беларусі палітычнымі і экономічнымі прычынамі як толькі стане на чаргу пытанне аб беларускай гасударсьцьвеннасьці.

Чуткі аб тым, што Літва і Украіна хочуць заўладаць Беларусьсю, ні маюць пад сабой грунту.

— На Літве і на Украіне, як і гэтта аб Беларусі думаюць ні інач эй як толькі аб нізалежнай дзержаве.

Меськія справы.

Бяседа з Меськім Войтам яг. С. Б. Хржонстоускім.

Наш супрацоўнік гэтымі днямі меў бяседу з новым Меськім Войтам м. Менску яг. С. Б. Хржонстоўскім які ні адмовіўся ласкава падзяліцца сваімі думкамі што да палітычнаго становішча Беларусі, а так сама і да прышласьці нашаго места ў зьвязку з арганізацыяй Беларусі як нізалежнай дзержавы.

— Беларускі нацыянальна-дзержаўны рух мае у асобе паважнаго С. Б. свайго прыхільніка ні ад нідаўняго часу. Будучы ураджэнцам і грамадзкай працаю зьвязаны з усім абшэрным Беларуска-Літоўскім краем, ён заўсёды відзеў кольскі шкоды для культурнаго разьвіцьця і краёвай гаспадаркі учыняе упраўленне з далёкаго, нізнаемаго з мейсцовымі патрэбамі і чужога для іх цэнтру і дзеля гэтаго быў пастаянным старонікам як найшырэйшай краёвай нізалежнасьці для Беларусі. Калі-ж адкрылася магчымасьць працы у гэтым кірунку, то ішчэ у 1917 годзе паважаны С. Б. заявіў п. Р. Скірмунту, быўшаму першым маршалкам Беларускаго Нацыянальнаго Камітэту, аб сваім жаданні працаваць для беларускаго дзержаўнаго адраджэння.

«Я лічу, што дваццацьтры гады жыцьця і грамадзкай працы у цэнтру Беларусі—сказаў яг. С. Б. Хржонстоўскі канчаючы гэту часьць бяседы—надалі мне ні толькі права, але і абавязкі беларускаго грамадзянства, якія я павінен споўняць.

Што-ж датыча палітычнай праграммы, то я саўўсім згаджаюся с праграммай яг. Р. Скірмунта».

«З умацаваннем беларускай дзержаўнасьці,—кажа паважаны Меські Войт пераходзячы да другой часьці бяседы,—значэнне Менску, як палітычнаго, культурнаго і экономічнаго цэнтру рысуецца мне надта высокім.

Ні кажучы ужо аб тым, што наагул арганізацыя Беларускай дзержавы і зьвязанае з ёй ажыўленне гаспадарскаго жыцьця краю павінны адбіцца добра на жыцьці беларускіх гарадоў, Менск атрымае пры гэтым найбольшую карысьць. Мне здаецца што як бы ні развязалося пытанне з Вільняй, Менск па сваім географічна-цэнтральным палажэнні павінен стаць палітычным цэнтрам—сталіцай. Разам с тым высока падніма ецца яго і экономічнае значэнне. Пасьля стварэння граніцы с Польшчаю Менск, лежачы на гандлёвых пуцях паміж Заходам і Усходам, павінен пераняць ад Варшавы яе даўнейшае значэнне як пункта абмену таварамі заходня—эўропэйскай прамысловасьці з Усходам, чым апраўдае і сваю гістарычную назву.

Менск павінен будзе так сама стаць цэнтрам вышэйшай навукі для ўсёй Беларусі. Канечне, лепі было-б у гэтым ісьці за прыкладам заходня—эўропэйскіх краёў, хацяб напр. Нямеччыны, дзе унівэрсытэты будуюцца як раз у нівялічкіх і ціхіх гарадах, але для гэтаго у нас покуль што за мало сілы. Наш унівэрсытэт павінен будзе прыймаць у свае сьцены студэнтаў—усе больш нізаможных станаў, для каторых патрэбна будзе, канечне разумная грамадзкая дапамога. Разам с тым тыя навуковыя сілы, каторыя будуць заняты у дзеле асьветы павінны будуць удзяліць сваіх усілкаў ішчэ і да дзержаўнай арганізацыйнай і палітычнай працы, бо—трэба з гэтым надта лічыцца—Беларусь пакуль што мае ішчэ мало патрэбных для гэтаго людзей.

Такой мне здаецца будучына Менску. Наша-ж цяперашняя задача—мая і другіх членаў магістрату—залежыць ад таго часоваго становішча у якім мы знаходзімся і ім акрэсьляецца. Гэта: варнуць парадак і лад у разбурэнную вайной і у часы рэвалюцыі меськую гаспадарку і падгатаваць такім чынам грунт для працы будучаго выбарнаго самапраўлення».

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 11 чэрвеня 1918 року.

Заходні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Баявая дзеяльнасьць быўшая у дзень умераная ажы[illegible] лася толькі на абедзьвух старанам Соммы. Пасьля моц[illegible] артылерыйскай падгатоўкі, вораг перайшоў вечарам у [illegible] ступленне меж рэкамі Анкры і Соммай. Мейсцовы варо[illegible] прарыў у шоссэ Корбі-Брэ быў устаноўлены контратак[illegible] перад другім жа фронтам прарыў быў адбіт з вялікімі [illegible] ворага стратамі.

Група арміяў Германскаго Кронпрынца.

За два дні бітваў наступленне генэрала фон Гю[illegible] прывяло нас да памечэнай мэты і заўладання ўвазду[illegible] мейсцовасьцю у Нуайона. Націск быў скіраваны на маца[illegible] ныя пазыцыі глыбока распаложанаго і падгатоўленаго [illegible] нашай контр-атакі ворага. Ні гледзячы на гэта, францу[illegible] дывізіі ні маглі працівіцца ні утрыманаму націску наш[illegible] войск і нават дывізіі армейскіх рэзэрваў, уведзеныя дз[illegible] асобных контр-атак у бой, былі учора у страшэннай бі[illegible] адкінуты. На правым флангу наступацельнаго руху вой[illegible] генэрала фон Этынгэра затрымалі забраныя намі варож[illegible] лініі паўднёвей Ассэнвілера, ні гледзячы на моцныя кон[illegible] атакі. Войскі генэрала фон Вэбэра б'юцца у Курсэлля і [illegible] абедзьвум старанам дарогі Руа—Эстрэ—Сен—Дэнн. Я[illegible] заўладалі узвышкай усходней Вэры, прарвалі чацьвёртую [illegible] рожую лінію і адкінулі ворага да Арронду. Ні гледзя[illegible] на упартую абарону, войскі генэрала фон Шэльке заўла[illegible] лі пераходам праз Мату.

Пасьля заўладання ўзвышкамі Маркіэгліс і гары Ві[illegible] мон яны ніўстрыманым націскам прабіліся да Отэнзіля. К[illegible] пус генэрала Гофмана с пастаянным боем прабіў варож[illegible] пазыцыі на узвышках поўднёвей Тьескур. На поўдне[illegible] склонам падаючым у ніз да Уазы мы прабраліся да Рыб[illegible]

Лік палонных павялічыўся больш як на 10,000 чала[illegible] так. чынам лік палонных узятых ад 27-го мая Групай [illegible] манскаго Кронпрынца даходзіць 75,000.

На фронце ад Уазы да Рэймса становішчо без пера[illegible] Узабнавіўшыя варожыя атакі паўночна заходней Шат[illegible] Тьерры былі адбіты з вялікімі для ворага стратамі.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Ізноў удалося заручыцца на два канцэрты (16 і 17 чэрвеня) у меськім тэатру гастролямі Віленскае Сымфонічнае капэлі пад вядомым кіраўніцтвам капэльмэйстра Бруно Платова.

Канцэрты будуць давацца на карысьць пацярпеўшым ад вайны. Адначасна с канцэртамі у фойэ тэатру робіцца выстава нямецкаго друку кнігаў. Тамака будуць выстаўлены выдавецтвы Лейпцыгу, Мюнхэну й Берліну, чым будзе паказано тое, што было зроблено у вобласьці выдаўніцтва за 4 годы вайны.

Як паведамляюць на канцэртах будуць выканаваны творы ні толькі вядомых композытароў Мэндэльсона—Бартольді і Бэтховэна, а так сама Мусоргскаго Рымскаго-Корсакова, Чайкоўскаго і Глазунова.

Усьпех гэтых канцэртаў саўсім пэўны, бо на гэты раз нас чакае вядомая ужо па нізвычайнаму штукарскаму выкананню капэля с тою добрай мэтаю, на якую прызначаны чысты даход.

Канцэрты будуць пачынацца роўна а $8^1/_2$ гадз. у вечары; у часе музыкі у залю нікого пушчаць ні будуць.

—

У меськай управе штат служачых, ні зложаны рэяльнай патрэбнасьцю і быўшы ціжарны для упраўскай кассы, патроху зьменьшаецца.

Будуць раскасіраваны аддзелы—труда і статыстычны. Гэто пасьля сконструіравання рады даверaных пры магістраце.

Цяпер жа пачалася «чыстка» у гаспадарскім аддзеле, дзе увольняецца ніпатрэбны элемэнт служачых.

—

Культурно-гідротэхнічное бюро губ. земства зноў пачало сваю працу. Заданні бюро: ізысканні дзеля улажэння сьмет і праэктаў асушэння, абвадненння і культуры зямлі: работы па абсушэнню і абвадненню зямель; указанне спосабаў культуры асушэнных угодзій; уладжэнне буравых, бэтонных, зрубовых студняў і нівэліровачных работ.

—

У сельска-гаспадарскім т-ве узаемнаго страхавання XX чарговы агульны сход членаў адбудзецца 17 чэрвеня дзеля падрахунку і разьначэння прыбытку за 1917 г., сьметы выдаткаў і пляна працы на 1918 г., выбары асоб на пасады і бягучых спраў.

—

Пачтовая гімназія, пад кіраўніцтвам Л. Н. Цветкова, пачынае гэтымі днямі сэзон падгатовак ва усе сярэднія школы. Плата—20 руб. у месяц.

Гімназія мае чатыры агульна-разрадныя клясы у абьеме прогімназіі.

Другія чатыры клясы—дзеля падгатоўкі на клясныя пасады па пачтова-тэлеграфнаму ведамству, а так-сама у вышэйшую школу—электро-тэхнічны інстытут.

Абучэнне вядзецца добра.

—

Нямецкая трупа «Остфронт», даўшая у меськім тэатры рад гастроляў, ад серады 12 чэрвеня, выезджае з Менску у Вільню. Як вядома, трупа знаходзіцца пад бліжэйшым кіраўніцтвам глаўнакамандуючаго усходнім фронтам.

—

С прычыны сьвята «Вознесения Господня», сягоння, 13 чэрвеня, праваслаўныя служачыя меськ. управы, земуправы, скарбовай палаты і інш. губ. установаў ад заняцьця асвабаджаюцца.

С прычын сьвята епіскапам Гэоргіем адбудзецца набажэнство у цэркві хрысьціянскай жаноцкай гімназіі (Шырокая вул. б. вучылішчэ дзевіц духоўнаго звання).

—

У губ. прысуцтві (Пецярбурская 4,) заўтра, 14 чэрвеня, адбудзецца першае судзебнае пасядзэнне пад старшынствам упраўляючаго скарбовай палатай Ікорскаго.

Назначано да разбору [illegible] грамадзкіх спраў, каторыя [illegible] старым ладу разбіраліся [illegible] дзенно па аўторкам, мэка[illegible] на, з раней загатоўлен[illegible] рэзалюцыямі, — рэзалюцы[illegible] штук за 200 і болей—за [illegible] гадзіны «пад старшынст[illegible] губэрнатора», па жалобам [illegible] рэшэнні паветовых зьез[illegible] і земскіх начальнікаў.

Трэба думаць, што ця[illegible] такога «фабрычнаго імпа[illegible] у судзебным разбіраецельс[illegible] ні будзе.

—

Рэгістрацыя салдат, у [illegible] цэляры паветоваго воінск[illegible] начальніка, пачатая 20 [illegible] цяпер адбываецца толькі [illegible] зінкамі.

Канец рэгістрацыі—заў[illegible] 14 чэрвеня.

Гэта рэгістрацыя, павэд[illegible] першай па ліку,—у тры р[illegible] меньшая, большасьць сал[illegible] выехала.

—

Спісак членаў рады даве[illegible] ных пры магістраце, расп[illegible] цованы меськай управай [illegible] ланы на пацьверджэнне у [illegible] мецкае градоначальство.

Апублікаванне яго ад[illegible] дзецца на гэтым жа тыдні.

—

Курсы беларусазнаўства.

13 чэрвеня лекцыя пр[illegible] М. Массоніуса (апошняя): [illegible] сторыя Беларускаго язы[illegible]

Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грыньлята.